**А.І.Смолік,** *доктар культуралогії,*
*прафесар, Беларускі дзяржаўны*
*універсітэт культуры і мастацтваў*

# МУЗЕЕФІКАЦЫЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ АБ’ЕКТАЎ БЕЛАРУСІ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

У канцы ХХ ст. у нашым грамадстве ўзрасла цікавасць да культуры мінулага. Такі інтарэс да культурнай спадчыны выклікаў усплёск музейнай справы. На фоне сацыякультурнай дэструкцыі, калі інтэнсіўна скарачаліся ўстановы культуры і мастацтваў, у галіне музейнага будаўніцтва адбываўся рост колькасці музеяў рознага тыпу. Так, за 19 апошніх гадоў у нашай краіне было зачынена больш за 5 тыс. бібліятэк, клубаў і Дамоў культуры. Вывучэнне сітуацыі ў музеязнаўстве сведчыць: музеі не толькі не зачыняліся, а наадварот, назіраўся працэс стварэння новых устаноў музейнага тыпу. У перыяд з 1990 г. па 2005 г. колькасць устаноў павялічылася са 111 да 133, а колькасць супрацоўнікаў на 1102 чалавекі [7, с. 58]. Такі сацыякультурны феномен можна растлумачыць тым, што сёння музеі пагружаны ў гісторыю і культуру і ўяўляюць сабой спецыфічную форму іх бытавання ў сучаснасці. Музей – гэта своеасаблівы архіў чалавечай памяці, дзе не павінны быць згублены часавыя перспектывы, таму што дзякуючы ім ажыццяўляецца рэпрэзентацыя наведвальніку культурнай спадчыны.

Музей з экспазіцыямі патрэбна разглядаць як культурны тэкст (знакавы, вербальны), што патрабуе прачытання. Рэпрэзентуючы наведвальніку тыя або іншыя матэрыялы, уводзячы яго ў сімвалічную рэальнасць, музей здзяйсняе ў практычнай рабоце пераход ад слова да падзеі і пры гэтым нярэдка пераўтварае наведвальніка ў непасрэднага і зацікаўленага ўдзельніка гэтай падзеі. У сучасных беларускіх музеях разгортваецца адукацыйны працэс, адбываецца збліжэнне раней разрозненых кампанентаў культуры, паколькі музей адначасова становіцца і тэатрам, і бібліятэкай, і школай. Традыцыйнае музейнае асяроддзе бытавання матэрыяльных прадметаў і твораў мастацтва ператвараецца ў змястоўна напоўненую прастору, у якой наведвальніку даецца магчымасць атрымаць разнастайныя ўражанні. Сёння кожны беларускі музей асэнсоўвае сябе ў якасці носьбіта канкрэтных старонак

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

айчыннай культуры і прапаноўвае наведвальніку розныя спосабы арыентацыі ў культурнай прасторы.

Сучасныя музеёлагі вызначаюць музей як гістарычна абумоўлены шматфункцыянальны інстытут сацыяльнай памяці, з дапамогай якога рэалізуецца грамадская патрэбнасць у адборы, зберажэнні і рэпрэзентацыі спецыфічнай групы культурных і прыродных аб’ектаў, што ўсведамляюцца грамадствам у якасці каштоўнасці, якую неабходна перадаваць з пакалення ў пакаленне. Гэты складаны арганізм уключае як сукупнасць музейных устаноў і захоўваемых там прадметаў гісторыка-культурнай спадчыны, так і прафесійную супольнасць – людзей, дзякуючы якім музеі ўзнікаюць і існуюць.

Важнейшы кірунак дзейнасці беларускіх музеяў – гэта музеефікацыя археалагічных аб’ектаў, якіх на тэрыторыі нашай краіны вельмі шмат. Так, на “Археалагічнай карце Беларусі” зафіксавана звыш 600 помнікаў палеаліту, мезаліту і неаліту, 2400 помнікаў бронзавага веку [4]. Вядомым беларускім археолагам Г.В.Штыхавым складзена асобная карта археалагічных аб’ектаў жалезнага веку, на якую нанесены гарадзішчы, селішчы, курганы, камяні з надпісамі і іншыя артэфакты гэтага веку [6] . Музеефікацыя іх уяўляе сабой комплекс мер, накіраваных на захаванне, экспанаванне археалагічных аб’ектаў з мэтай прапаганды гістарычных ведаў і фарміраванне нацыянальнай свядомасці.

Першыя спробы музеефікацыі археалагічных знаходак адносяцца да першай паловы XIX ст., калі братамі К.П.Тышкевічам і Я.П.Тышкевічам у 1842 г. у радавым маёнтку ў Лагойску быў створаны музей старажытнасцей. Яго аснову склалі археалагічныя артэфакты, знойдзеныя імі пры даследаванні курганоў, гарадзішчаў, замчышчаў на Міншчыне. У 1856 г. на аснове экспанатаў Лагойскага музея старажытнасцей Тышкевічамі заснаваны Віленскі музей старажытнасцей, які размяшчаўся ў бібліятэцы Віленскага універсітэта. Пераважная большасць матэрыялаў была з Беларусі. Праўда, праіснаваў музей нядоўга. Пасля задушэння паўстання 1863–64 гг. музей быў зачынены. Шмат экспанатаў адпраўлена ў Маскву. Пазней музей быў рэканструяваны і русіфікаваны і ў такім выглядзе праіснаваў да Першай сусветнай вайны. У канцы XIX ст. у фондах музея налічвалася больш за 12 тыс. экспанатаў, якія былі размеркаваны па аддзелах археалогіі, этнаграфіі, мастацтва, зброі, мінералогіі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арніталогіі [5, с. 127–128]. Супрацоўнікамі музея ўпершыню выкарыстаны метад захавання прадметаў па аднароднасці матэрыялаў, з якіх яны зроблены.

Шмат намаганняў па зберажэнні і трансляцыі археалагічных помнікаў было зроблена сябрамі Віленскай археалагічнай камісіі, створанай па ініцыятыве Я.П.Тышкевіча. Яна існавала пры Віленскім музеі старажытнасцей. У склад камісіі ўваходзілі вядомыя тагачасныя даследчыкі матэрыяльнай і духоўнай культуры: М.Балінскі, А.К.Кіркор, І.Крашэўскі, Т.Нарбут, А.А.Плятар, У.Сыракомля, К.П.Тышкевіч і інш. Камісія збірала матэрыялы па гісторыі краю, звесткі пра ўладальнікаў археалагічных артэфактаў, наладжвала археалагічныя экспедыцыі, абмяркоўвала вынікі іх працы, выпускала “Запіскі Віленскай археалагічнай камісіі”, публікавала краязнаўчыя працы.

Сістэматычная работа па музеефікацыі археалагічных аб’ектаў пачалася ў Беларусі ў другой палове XX ст. Яе вынікам стала стварэнне Краснасельскага археалагічнага комплексу на тэрыторыі Ваўкавыскага раёна. Комплекс уключае групу помнікаў матэрыяльнай культуры ад эпохі мезаліту да позняга Сярэдневякоўя. У гэты ж перыяд ажыццёўлена музеефікацыя Берасцейскага гарадзішча. Раскоп, плошча якога складае 1832 кв. метры, перакрыты стацыянарным павільёнам. Музейная экспазіцыя складаецца з рэшткаў забудовы Бярэсця XIII ст. і рэчаў матэрыяльнай культуры XI – пачатку XIV ст.

Значны ўклад у справу захавання і трансляцыі археалагічных помнікаў зрабіў Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, заснаваны ў 1957 г. (Беларускі дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей). У складзе музея 10 экспазіцыйных і выставачных залаў, плошча якіх 1214 кв. метраў. У асноўных фондах знаходзяцца больш за 250 тыс. экспанатаў – калекцыі археалогіі, нумізматыкі, сфрагістыкі, зброі, этнаграфіі і інш. Да унікальных археалагічных помнікаў адносяцца рэшткі першабытнага жытла з касцей мамантa, неалітычныя прылады працы з крэменездабыўных шахт, упрыгажэнні з косці, шкла і бурштыну і іншыя археалагічныя знаходкі. Супрацоўнікамі музея створаны стацыянарныя экспазіцыі: “Старажытная Беларусь” (першабытная эпоха і Сярэдневякоўе), “Старадаўняя геральдыка Беларусі”, “З гісторыі зброі”, “Стары гарадскі побыт”.

Маштабную дзейнасць па фарміраванні гістарычнай памяці праводзіць Музей старажытнабеларускай культуры, заснаваны ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1977 г. пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Гэтая ўстанова назапасіла звыш 17 тыс. экспанатаў, у тым ліку 6 тыс. рэчаў з помнікаў найважнейшых археалагічных культур. Тут экспануюцца матэрыялы эпох палеаліту, мезаліту і неаліту, знойдзеныя на старажытных стаянках Бердыж, Елісеевічы, Юравічы, Камень, Асавец, Крывіна, Маскавічы. Асобныя рэчы датуюцца 26 тыс. гадоў назад (прылады палявання на мамантаў).

Актывізацыі музеязнаўчай справы садзейнічаў краязнаўчы рух, вынікам якога з'явіліся шматлікія краязнаўчыя арганізацыі і музеі. Так, у 1927 г. ужо дзейнічалі 240 арганізацый і 18 музеяў. На хвалі краязнаўства ствараліся не толькі абласныя, раённыя, гарадскія, але і музеі навучальных устаноў, якія садзейнічалі гістарычнай адукацыі і фарміраванню самасвядомасці моладзі. Яскравым прыкладам такой дзейнасці з'яўляецца Музей Беларускага Палесся, адкрыты ў 1926 г. як Палескі краязнаўчы музей. У яго археалагічнай калекцыі налічваецца каля 10 тыс. адзінак захавання. Тут экспануюцца матэрыялы з раскопак могільнікаў Велямічы, Дубай, Рамель, гарадзішча Хатомель, Пінскага замчышча і інш. У экспазіцыі музея калекцыя керамічных плітак XII ст. – адзіная ў Беларусі па колькасці (30) і разнастайнасці формаў. Каштоўнасцю музея з'яўляецца нумізматычная калекцыя манет, якая налічвае 17,8 тыс. экзэмпляраў ад старажытнарымскіх да сучасных.

У пачатку 20-х гг. мінулага стагоддзя быў адчынены музей гісторыі першабытнай культуры і рэлігіі пры БДУ, які пазней быў пераўтвораны ў гісторыка-археалагічны музей, а ў 1977 г. – у музей гісторыі БДУ. У археалагічным аддзеле музея захоўваюцца каля 8 тыс. старажытных прадметаў. У музеі экспануюцца знаходкі з палеалітычных стаянак Бердыж, Юравічы, раскопак гарадзішчаў, шэрага беларускіх гарадоў (Мінск, Орша, Копысь, Рагачоў).

Сёння практычна ва ўсіх гарадах нашай краіны існуюць гісторыка-краязнаўчыя музеі, што праз гістарычнае апісанне і экспанаванне помнікаў і прадметаў даўніны фарміруюць успрыманне мясцовымі жыхарамі іх мінулага. Прадметна-дакументальным пластом азначаных музеяў з'яўляецца сукупнасць гістарычных падзей і фактаў, якія адбываліся ў пэўным рэгіёне. Залаты фонд шматвяковай айчыннай культуры ў гэтых музеях складаюць археалагічныя артэфакты. Так, у Вілейскім гісторыка-краязнаўчым музеі, заснаваным у 1982 г., значную частку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экспанатаў складаюць матэрыялы археалагічных раскопак на тэрыторыі раёна (паселішча Сосенка, гарадзішча Малышкі).

Такім чынам, можна канстатаваць, што музеямі Беларусі вядзецца значная работа па музеефікацыі культурна-гістарычнай спадчыны. Але вялікая колькасць археалагічных помнікаў не ахоплена працэсам музеефікацыі. Яны падпадаюць пад пастаяннае прыроднае і антрапагеннае ўздзеянне, мноства іх разбурана і пашкоджана. Інфармацыя аб загубленых археалагічных аб’ектах утрымліваецца ў калектыўнай манаграфіі “Страчаная спадчына” [7]. Далейшыя ахова, рэстаўрацыя, кансервацыя і іншыя формы музеефікацыі археалагічных помнікаў дазволяць спыніць знішчэнне. На наш погляд, археалагічныя артэфакты ў першую чаргу неабходна дакументаваць, ажыццяўляць маніторынг іх стану. Наспеў час стварэння планаў аховы, зберажэння і папулярызацыі помнікаў гісторыі, якія знаходзяцца ў пэўнай мясцовасці. Дарэчы, у шэрагу еўрапейскіх краін такія планы ўключаюцца ў агульную сістэму планіроўкі і развіцця гарадоў і іншых тыпаў населеных пунктаў.

1. *Алексеев, В.П.* Музееведение. Музеефикация. Культура / В.П.Алексеев // Вестн. музейн. комиссии. – М., 1990. – № 1. – С. 10–19.

2. *Беларуская* культура сёння. 2005. Гадавы агляд. – Мн.: БелІПК, 2006. – 58 с.

3. *Гужалоўскі, А.А.* Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А.А.Гужалоўскі. – Мн.: Веды, 2002. – 130 с.

4. *Исаенко, В.Ф.* Археологическая карта Белоруссии. Памятники бронзового века / В.Ф.Исаенко. – Мн.: Полымя, 1976. – Вып. 3. – 150 с.

5. *Каханоўскі, Г.А.* Віленскі музей старажытнасцей / Г.А.Каханоўскі // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. – Мн.: БелЭн, 1993. – 702 с.

6. *Штыхов, Г.В.* Археологическая карта Белоруссии. Памятники железного века и эпохи феодализма / Г.В.Штыхов. – Мн.: Полымя, 1971. – 275 с.

7. *Страчаная* спадчына: навукова-папулярнае выданне / рэдкал.: Т.В.Габрусь, А.М. Кулагін [і інш.]. – Мн.: Веды, 1998. – 350 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ